*В. С. Варапаева,*
*кандыдат педагагічных навук,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў*

# САМАСТОЙНАЯ РАБОТА НАД МАСТАЦКІМІ ТВОРАМІ ЯК СРОДАК АКТЫВАЦЫІ ТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Працэс літаратурнай адукацыі студэнтаў прадугледжвае, з аднаго боку, бездакорнае веданне спецыфікі літаратуры як віду мастацтва і на гэтай падставе ўменне аналізаваць яе, а з другога – патрэбу і ўменне назапашваць інфармацыю аб пісьменніках, выданнях кніг, розных відах і жанрах літаратуры – фарміраванне шырокага кола чытання. Шматлікія даследаванні ў галіне псіхалогіі, педагогікі і літаратуразнаўства, нашы асабістыя назіранні сведчаць, што ўзровень літаратурнай адукацыі, літаратурнага развіцця студэнтаў жадае лепшага. Па-першае, вывучэнне твораў пісьменніка ў школе не становіцца стымулам для іх далейшага самастойнага чытання. Па-другое, аналіз літаратурных твораў у школе не заўсёды спрыяе разуменню літаратуры як віду мастацтва, іначай як растлумачыць той факт, што большасць студэнтаў свае меркаванні аб творы зводзяць да прасцейшага пераказу зместу. Разуменне сутнасці майстэрства пісьменніка, яго адметнасці адсутнічае, як і ўяўленне пра тое, што праз літаратуру можна пасцігнуць духоўны вопыт чалавецтва і, такім чынам, узбагаціцца самому. У апошнія гады падае прэстыж чытання, страчваецца культура чытання, амаль выпадаюць з поля зроку класіка, цэлыя пласты народнай творчасці. Усё часцей праяўляюцца раўнадушныя адносіны да сур’ёзных духоўных каштоўнасцей і, наадварот, незвычайна моцная цяга да простай забаўляльнасці. Растучая бездухоўнасць становіцца адной з прычын праяў непавагі да грамадскіх нормаў і ўвогуле закону. Гэтыя факты вельмі трывожныя. Адмаўленне ад літаратуры – гэта ў значнай ступені адмаўленне ад духоўнасці. Ступень жа духоўнасці чалавека, яго творчая прадуктыўнасць вызначаюцца вядучымі патрэбамі: патрэбай вечнага пазнання і патрэбай жыць не толькі сваімі думкамі, пачуццямі, але і чужымі. Вось гэтымі «чужымі» думкамі, пачуццямі насычаны літаратурныя творы, якія распавядаюць пра вечныя маральныя, эстэтычныя каштоўнасці і здольны пераўтварыць маральныя веды ў перакананні.

Фарміраванне асобы чалавека пад уздзеяннем мастацтва здзяйсняецца перш за ўсё менавіта ў працэсе непасрэднага

ўспрымання твора, шляхам эмацыянальнага ўключэння ў чужое жыццё, пачуцці, іх пасціжэнне, разуменне, засваенне свядома ці на ўзроўні падсвядомасці.

Такім чынам, фарміраванне творчага чытача – адначасова і выхаванне маральнай асобы. Гэта не два працэсы – двуадзіны працэс: чым больш эстэтычна пісьменны чытач, тым больш значны педагагічны вынік чытання. Эстэтычная прырода твораў мастацкай літаратуры прадугледжвае іх успрыняцце як працэс індывідуальна творчы. Па-першае, таму што чытанне – гэта даверлівы дыялог пісьменніка і чытача. Па-другое, таму што творчае чытанне – абавязкова актыўная духоўная сутворчасць чытача і пісьменніка. Чытач як бы паўтарае ўжо пройдзены аўтарам твора шлях, знаёмячыся і пазнаючы жыццё, адноўленае ў творы. Гэта духоўная дзейнасць працягваецца і пасля таго, як перагорнута апошняя старонка кнігі: узнікаюць пачуцці, думкі, развагі, вобразы працягваюць жыць, выклікаюць параўнанні, асацыяцыі, уплываюць на ўжо складзеныя раней устаноўкі, погляды. Духоўная прырода чалавека ўзбагачаецца ў працэсе творчага чытання. Але гэта адбываецца толькі тады, калі чытанне становіцца патрэбай, калі яно ўнутрана неабходна і значыма. Творчае чытанне прадугледжвае патрэбу ў пэўнай сістэме спецыяльных тэарэтычных ведаў пра літаратуру, мастацкую творчасць, а таксама эмацыйную рэактыўнасць, жывасць інтарэсаў, зацікаўленасць асобы.

Гётэ характарызаваў тры віды чытачоў: першыя – хто атрымлівае асалоду, не разважаючы; другія – хто мяркуе, не атрымліваючы асалоды, і трэція, сярэднія, – хто мяркуе, атрымліваючы асалоду, і атрымлівае асалоду, разважаючы. Менавіта гэтыя, апошнія, і аднаўляюць па-новаму твор. Вось такіх чытачоў павінны рыхтаваць і мы. Асабліва тых, хто будзе працаваць з дзецьмі. А для гэтага ў методыцы выкладання, літаратуразнаўстве ёсць неабходныя спосабы, метады, прыёмы. Адным з іх з'яўляецца эстэтыка-функцыянальны аналіз твора, якому навучаюцца студэнты ў курсе «Сусветная літаратура для дзяцей і юнацтва» і курсе «Беларуская літаратура». У яго аснове – апора на ўзроставыя, індывідуальныя інтарэсы і жыццёвы вопыт кожнага студэнта.

Даследаванні, якія праводзіліся ў 1960–1990-я гг. Г. В. Давыдовіч [2], Т. Д. Полазавай [3] і інш., сведчаць, што ў большасці моладзі адзначаецца нізкі канстатуючы ўзровень успрымання, хаця імкненне да аналізу ёсць, але праяўляецца яно толькі ў жаданні аналізаваць фабулу. Адзінства трыяды (аўтар–вобраз–чытач), характэрнае для эстэтычнага ўспрыняцця, парушаецца і паўстае ва ўсечанай формуле «вобраз–чытач». А гэта, у сваю чаргу, не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дазваляе адчуць аўтарскую пазіцыю, менавіта – сацыяльную, чалавеказнаўчую ўстаноўку твора.

Апора на ўзроставыя і індывідуальныя інтарэсы студэнтаў пры эстэтыка-функцыянальным аналізе ў спалучэнні з літаратуразнаўчым і лінгвістычным дазваляе наблізіць да чытачоў жыццёвыя праблемы, якія складаюць сутнасць канфлікту ў вывучаемым творы, высветліць яго прычыны, ацаніць маральную пазіцыю герояў, унутраныя і знешнія матывы іх учынкаў, адносіны да герояў аўтара, яго пазіцыю ў канфлікце, формы, сродкі праяўлення аўтарскай пазіцыі (мова, дэталь, падтэкст, шчырасць, лірызм ці публіцыстычнасць). Ва ўсім гэтым, відаць, і заключаецца спецыфіка і сіла магчымага ўздзеяння твора на чытача.

Эстэтычна-функцыянальны аналіз эфектыўны таму, што ён накіраваны на ўзмацненне ачышчальнай (катарсіснай) функцыі мастацтва. Л. С. Выгоцкі, распрацаваўшы псіхалогію мастацкай дзейнасці, да якой адносіцца і творчае чытанне, разглядаў катарсіс як завяршальную стадыю псіхалагічнага працэсу, што ляжыць у аснове эстэтычнага ўспрыняцця. Уздзейнічаючы на псіхіку чалавека, твор мастацтва выклікае такі эмацыянальны стан, які прыводзіць да разрадкі эмоцый, аблягчэння і ўзвышэння ўнутранага Я.

У працэсе навучання эстэтыка-функцыянальнаму аналізу неабходна і пэўная практычная дзейнасць. Агульнавядома, для таго, каб чалавек разумеў мастацтва, яму патрэбны, як гаварылася вышэй, пэўныя веды пра яго. Такія веды студэнты атрымліваюць у лекцыйных курсах і на семінарскіх занятках. Але толькі пераказ чужых думак недастатковы, як правіла, для развіцця ўласных меркаванняў. Самастойная вучэбна-даследчая работа студэнтаў, пры кіруючай ролі выкладчыка, і дапамагае фарміраваць асабісты погляд. Пакажам, як гэта можа здзяйсняцца, на прыкладзе аналізу твора К. С. Льюіса «Хронікі Нарніі» (курс «Сусветная літаратура для дзяцей і юнацтва»). Студэнтам прапануецца прачытаць творы і выканаць наступныя заданні: якія прадметы зацікавілі дзяцей у пакоі дзядзькі Эндру? як разумееце сэнс слова «эгаіст»? каго з персанажаў можна назваць эгаістам? што апісвае Дыгоры? чаму дзеці не вярнуліся дамоў, а пайшлі даследаваць новыя сусветы? выкарыстоўваючы тэкст, складзіце апісанне месца, куды трапілі Дыгоры і Полі «с помощью колец»? якія словы былі напісаны на «каменной колонне» і іх сэнс? як разумееце прымаўку: «Не испугается червя тот, кто видел змею, коровы – тот, кто видел бешеного быка»? якім прыёмам карыстаецца аўтар, каб паказаць сілу Каралевы? чаму Каралеве было дрэнна ў лесе паміж сусветам?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

параўнайце стварэнне свету, апісанае ў Бібліі, са стварэннем свету Нарніі, запоўніце табліцу; пры чытанні адзначце ўрыўкі, якія падобны да біблейскіх; чаму Эндру не мог чуць і разумець тое, што адбываецца ў Нарніі? закончыце мудрыя словы Аслана, выкарыстоўваючы тэкст: «Плод хорош, но он приносит благо только тогда…», «Она получила то, что хотела: неистощимую силу и бесконечную жизнь, как богиня, но для злых сердцем долгота дней…»; якое папярэджанне чалавецтву даў Аслан?

Напрыканцы студэнты павінны зрабіць высновы, да прыкладу:

1. Твор напісаны ў жанры казкі. 2. У аснове сюжэтаў ляжаць фантастычныя прыгоды дзяцей у розных сусветах; стварэнне Нарніі. 3. З дапамогай сваіх казак аўтар хацеў паказаць: наступствы, да якіх могуць прывесці неабдуманыя ўчынкі; чалавечы эгаізм; зло – гэта не стварэнне прыроды; мадэль стварэння свету. Навучыць – сяброўству, узаемадапамозе, адказнасці, любові да прыроды; выхоўваць у дзецях лепшае, развіваць фантазію.

Апрача творчых заданняў, накіраваных на глыбокае асэнсаванне сэнсу твора, студэнтам варта прапаноўваць: напісанне рэцэнзій на творы пісьменнікаў, складанне сцэнарыяў, праблемныя паведамленні з элементамі дыскусіі, даклады праблемнага характару і інш.

Аналіз мастацкага твора здзяйсняецца ад «эмацыянальнага да лагічнага». Пакуль твор не адчуты, не перажыты – няма патрэбы ў аналізе. Выяўленне асабістых пачуццяў, уражанняў, захапленняў альбо наадварот – непрыняцце твора – гэта першы і надзвычай важны крок у рабоце над тэкстам. Пра мастацтва неабходна і гаварыць моваю мастацтва. Для пэўнага ўзросту існуюць канкрэтныя метады і прыёмы. Але важна памятаць, у гаворцы пра твор павінны прысутнічаць развагі не толькі пра тое, што напісана, а і абавязкова, як гэта зроблена.

1. *Асмус, В. Ф.* Чтение как труд и творчество / В. Ф. Асмус // Вопросы теории и истории эстетики. – М. : Искусство, 1968. – С. 56–64.

2. *Давидович, Г. В.* Школьник как читатель русской классики / Г. В. Давидович // Юный читатель и библиотека : сб. науч. тр. – М. : [Б. и.], 1991. – С. 38–46.

3. *Полозова, Т. Д.* Единство мысли, чувства и действия / Т. Д. Полозова. – М. : Знание, 1978. – 46 с.

4. *Рожина, Л. Н.* Искусство быть читателем / Л. Н. Рожина. – Минск : Нар. асвета, 1987. – 213 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ